Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 3. С. 105–108.

# Літаратуразнаўства

УДК 82.091

## ТЫП ПАЛЯЎНІЧАГА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПАРАДЫГМЕ ПАМЕЖЖА ЭПОХ

**А. І. Белая,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры філалогіі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Паступіў у рэдакцыю 13.06.17.

UDC 82.091

## THE TYPE OF HUNTER IN THE CULTURAL PARADIGM OF THE BORDERLINE EPOCH.

**E. Belaya,**
*Candidate of Pedagogic, Associate professor, Professor of the Department of Philology, Baranovichi State University*

Received on 13.06.17.

У артыкуле на матэрыяле літаратурных твораў беларускіх і рускіх аўтараў аналізуецца тып паляўнічага як сацыяльная катэгорыя, мастацкая з'ява, метафара адметнага тыпу ведаў, элемент «следапытнай» парадыгмы; вызначаецца канцэпцыя «ляснога чалавека» як гарманічнай, творчай, свабоднай асобы; робяцца высновы пра трансфармацыю ідэі названага вобраза-персанажа ў паслякастрычніцкую эпоху.

*Ключавыя словы:* паляўнічая тэматыка, аўтарская канцэпцыя, «тэрыторыя свабоды», універсальная сувязь, «доказавая» парадыгма.

Taking the literary works of Belarusian and Russian authors as a ground, the article analyzes the type of hunter as a social category, an artistic phenomenon, the metaphor of a special kind of knowledge, an element of the «pathfinder» paradigm. It defines the concept of a «forest man» as a harmonious, creative, free personality. The conclusions about transformation of this image-character idea in the post-October period are drawn.

*Keywords:* hunting theme, author's concept, «territory of freedom», universal link, "paradigm of evidence".

Тыпалогія персанажаў – гэта іх рэпрэзентацыя па пэўных аспектах, праз якія ствараецца цэласны вобраз. Сацыяльна-гістарычны аспект уключае гістарычны кантэкст, сацыяльны стан, узрост персанажа. У прозе пераходных эпох літаратурныя героі ў першую чаргу выступаюць як сацыяльна пэўныя тыпы. Традыцыйны прадстаўнік персанажнай сферы беларускай літаратуры – «лясны чалавек»: лоўчы, паляўнічы (часта ён жа і палясоўшчык), асоба якога сфарміравана характарам жыццядзейнасці. Нацыянальная адметнасць гэтага тыпа не выключае наяўнасці ўніверсальных канцэптуальных рыс, абумоўленых яго эстэтыка-філасофскім зместам. У персанажах паслярэвалюцыйнай эпохі, пры пэўнай дэфармацыі, традыцыйныя ментальна-каштоўнасныя рысы асобы паляўнічага застаюцца нязменнымі.

Мастацкія дамінанты асобы лоўчага акцэнтаваны ў «Песні пра зубра» М. Гусоўскім, якому добра вядомы «ловы, і праца, і хлеб... зароблены потам» [1, с. 62]. Чалавек на паляванні нібы далучаецца да звярынага жыцця, часам адчувае сябе нават больш спрытным і дужым, чым звер, або самым шчаслівым і магутным са звяроў. У шляхетным XIX стагоддзі паляванне – неад'емны «топас мужчыны» [2, с. 102], які не меў сілы, па словах У. Караткевіча, «адмовіцца ад стрэльбы, вогнішча і ветру» [3, с. 198]. Гэта быў атрыбут арыстакратычнага існавання, якое ўключала вольны і мужны лад жыцця, прыгоды, небяспеку, жорсткае спаборніцтва з падобнымі істотамі з плоці і крыві, неверагоднае напружанне сіл. Утрапёны паляўнічы, сцвярджаў І. Тургенеў, азначае «выдатны чалавек» [4, с. 3], а паляванне з ружжом і сабакам цудоўнае ўжо само па сабе. Хто, акрамя паляўнічага, здольны адчуць, як радасна блукаць досвіткам па кустоўі, як прыемна ўвечары вяртацца хуткай, нягледзячы на стому, хадою туды, дзе чакаюць стол пад белым абрусам, запаленая свечка, вячэра?.. Да асабліва шчымлівага роздуму схіляе паляванне ў познюю восень, калі душу агортвае незразумелая трывога, а ва ўяўленні, што лунае, як птушка, паўстаюць «любімыя вобразы, мёртвыя і жывыя... нечакана прачынаюцца ўражанні, што даўным-даўно заснулі... Усё жыццё разгортваецца лёгка і хутка, як скрутак; усім сваім мінулым, усімі пачуццямі, сіламі валодае чалавек» [4, с. 251].

Вобраз паляўнічага ў новай беларускай літаратуры часта выступае як адна з дзвюх сутнасцей палясоўшчыка, на канцэпцыю вобраза якога паўплывалі перш за ўсё ўзоры, назапашаныя, як піша А. Адамовіч, «сціплай нашай літаратурай

беларускай» [5, с. 397]: вобраз Тараса з паэмы К. Вераніцына, старога лесніка Я. Лучыны, «нават у некаторай меры вобраз “ляснога чалавека” – “Дзеда Завалы” Ядвігіна Ш.» [5, с. 397]. Я. Карскі адзначаў, што ў вобразе старога лесніка Грышкі выведзены «цэльны, моцны характар, нярэдкі сярод беларусаў» [5, с. 431]. Ключавы вобраз гэтай галерэі – Міхал у паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Васіль Чурыла ў аднайменным апавяданні, Максім Заруба («Малады дубок»), Міхась («Чорт») – «гэта толькі варыянты таго ж Міхала з “Новае зямлі”» [5, с. 398].

Але ў канцы XIX стагоддзя «шляхецкія гнёзды» з іх паэтыкай пачынаюць сыходзіць у мінулае. 1917 год канчаткова змяніў прыярытэты. Дэкаратыўныя атрыбуты ранейшага жыцця ў «эпоху рубяжа» зрабіліся больш уражлівамі. Паляўнічы і рыбак у прозе 1-й трэці XX стагоддзя не з’яўляюцца вельмі значнымі літаратурнымі асобамі. Як напісаў Я. Колас, «Хоць, праўда, хлеб ядуць і з вуды, / Але не ўсе і не заўсюды...» [7, с. 459]. Герой апавядання З. Бядулі «Сон Анупрэя» – рыбак, які «адправіўся нанач паставіць венцеры на шчасце» [8], але гэтая падзея не з’яўляецца сюжэтаўтваральнай. Беларусы кіраваліся прынцыпам «Што зарабіў, тое і сцерабіў», а паляўнічае і рыбацкае шчасце ўсміхалася не кожнаму. Прычына зніжэння пафасу асобы лоўчага бачыцца і ў тым, што няўхільна змяняецца стаўленне да прыроды, яно робіцца спажывецкім.

У час «траістай» вайны на свет чалавечых узаемадачыненняў актыўна пераносіцца апалогія цкавання звера. Змітрок, галоўны герой апавядання С. Хурсіка, на фронце ўпершыню штыком забіў чалавека, нібы «пацука на шыла ўссадзіў». Аповед салдата багаты на экспрэсіўную лексіку. Палонны паляк, стары, сівы, «пазірае, усё роўна як звер». Канваіра не слухае, «імчыцца, як сабака», а той за ім «па жыце… нібы за ваўком улёгшыся…». Паляўнічы імпэт вызначае і моўна-выяўленчыя сродкі фінальнага эпізоду: «Як звер, скок ён на мяне, а я, што было моцы, сціснуў стрэльбу і як жарну з усяго размаху яму ў хару, дык ён толькі – вяк, – і тут жа ля маіх ног і выцягнуўся…» [9, с. 243–245]. Апавядальнік-паляўнічы ў творы М. Чарота «Чалавек без барады» адкрывае сакрэты псіхалагічных назіранняў за паводзінамі «паганага звера» ваўка, пераносячы яе рысы на асобу выкрытага ім былога пана земскага, які пасля рэвалюцыі ўхітрыўся ўладкавацца ў адзін з наркаматаў. Забіўшы ж зайца, «чалавек без барады» прызнаецца: «Вось як бяжыць – ахвота папасці, а... глянеш на ляжачага – неяк шкода…» [9, с. 33]. Без спачування да чалавека, пісаў М. Прышвін, напэўна, не можа быць спачування і да жывёлы, «і для адчування жалю абавязкова павінна быць у жывёле якое-небудзь падабенства да чалавека» [10, с. 135–136]. Гэты матыў рэпрэзентаваны У. Караткевічам у развітальным маналога пані Антаніды Загорскай («Каласы пад сярпом тваім»).

Часы ваеннага камунізму гранічна абвострылі праблему выжывання. І хоць для беларускага селяніна яна заўсёды была актуальнай, ідэя вобраза паляўнічага ў айчыннай прозе ўсё ж не зводзіцца толькі да ўдалага пошуку «пер’я і пуху». Гэты мастацкі тып пашырае ўяўленне пра гуманізм аўтарскай пазіцыі. Афарыстычнае выказванне «Прырода любіць аратага, песняра і паляўнічага» [10, с. 133] падкрэслівае як творчую сувязь усіх гэтых асоб з прыродай, так і іх канцэптуальнае падабенства. Пра асалоду выехаць на ловы да світання і назіраць за паступовым абуджэннем прыроды пранікнёна пісаў І. Тургенеў. «Слаўны стары паляўнічы» пан Міханевіч («Салавей» З. Бядулі) выбіраўся з дубальтоўкай на цецерукоў надзвычай рана, «яшчэ сам Бог спаў» [8]. У. Караткевіч акцэнтуе ўвагу на тым, што паляванне дае чалавеку магчымасць вярнуць страчаную гармонію. Безумоўна, яго можна лічыць грэшным і сорамным заняткам, але ўсё роўна добра, што яно ёсць, «бо праз яго стомленыя людзі пачынаюць любіць жыццё» [3, с. 198]. Паляўнічая жарсць – той псіхічны выбух, які дазваляе пераадолець душэўную раздвоенасць, – і свет зноў паўстае перад чалавекам жаданым і цудоўным. Так бывае, пісаў М. Прышвін, «у закаханых, паэтаў... страсна-добрых, рэлігійна-любячых, удачлівых ігракоў і дурняў (Дастаеўскі на гэтым шляху стварыў свайго кн. Мышкіна)» [10, с. 111].

Значная роля ў тэматызацыі палявання належыць Э. Самуйлёнку (апавяданне «Паляўнічае шчасце», 1933). У творы ёсць яскравыя штрыхі, якія акрэсліваюць агульны абрыс аўтарскай канцэпцыі героя-паляўнічага. У ёй пераважаюць традыцыйныя рысы. «Паляўнічае вока» дзядзькі Лаўрэна – фактар назіральнасці і дасціпнага розуму, здольнасці пранікліва бачыць, «што навокал дзеецца…» [11, с. 17]. Лаўрэн дасканала расчытвае мову звярыных і птушыных слядоў на заснежаным рэчышчы. У яго адмысловая стрэльба, аднаствольная, перароблена з дапатопнай крамянёвай, – «даўнейшая», тых часоў, калі «і звер быў вялікі, і народ… дужы быў, што мог з гэткай штукі ўзапар страляць» [11, с. 19]. У рыбалоўстве Лаўрэн таксама «стаяў па-за канкурэнцыяй». На рацэ ён адчуваў сябе гаспадаром, «гаспадарыў у рачных зараслях…» [11, с. 19]. Для чалавека гэта своеасаблівая «тэрыторыя свабоды».

Магчыма, па гэтай прычыне і Вінцэнт Заблоцкі, з твора Л. Калюгі, стаміўшыся іграць на чужых вяселлях, зашываецца ў прырэчныя зараснікі і аднаўляе свае духоўныя сілы. Пры гэтым для яго зусім неістотна, зловіць ён хоць што ці не. Можна сказаць, што занятак рыбака і паляўнічага, таксама як і занятак музыкі, стаяў на мяжы паміж светам і іншасветам. Каб шанцавала на ловах, паляўнічаму часам даводзілася, як герою Я. Баршчэўскага («Вужыная карона»), пайсці на змову з нячысцікам. Дачыненне нячыстай сілы да рыбацкага шчасця Лаўрэна зазначаюць аднавяс-

коўцы: «Лаўрэн – вадзяны чорт. Ён валавяны гузік на нітку начэпіць і выцягне на дзесяць фунтаў шчупака» [11, с. 19]. І ўсё ж у апавяданні досыць моцна адчуваецца кан'юнктурны матыў: Э. Самуйлёнак час ад часу падкрэслівае, што «Лаўрэн з калгаса "Іскра сацыялізму"». Паляўнічае шчасце Лаўрэна ўвасабляе выдра: за шкуру ўпаляванага звярка ён марыць набыць радыёпрыёмнік. Нягледзячы на канкрэтную практычную мэту, якой кіруецца Лаўрэн, у творы звяртае на сябе ўвагу момант, па словах М. Прышвіна, адчування вечнасці і роднаснай увагі да свету, калі паляўнічы выступае своеасаблівым «указальнікам» агульнай сувязі ўсяго існага. Пра яе гаворыць і У. Караткевіч у эпізодзе апошняга палявання Юрыя Загорскага. У пана Юрыя твар стаў «драпежны і строгі», а «…сіні агонь у вачах звера звязаў яго з вачыма чалавека разуменнем еднасці ўсяго жывога» [3, с. 206].

Адна з вечных тэм – тэма свабоды чалавечай асобы, вольнага выбару. Гэты аспект нібыта і не вызначае праблематыкі апавядання Э. Самуйлёнка (бо твор пісаўся тады, калі найбольшую свабоду чалавек меў ад свабоды выбіраць), але паслядоўна акцэнтуецца аўтарам. Жонка Лаўрэна Тэкля просіць маладога старшыню паўплываць на аматара палявання праз праўленне, але той пярэчыць: маўляў, як чалавек хоча, так і робіць. Аднак неўзабаве Лаўрэна ўсё ж вымушаюць «пераключыцца на лён», і ўсякія доказы таго, што менавіта зараз вырашаецца яго «паляўнічае шчасце», на старшыню не дзейнічаюць. Маральны ціск на Лаўрэна ўзмацняецца, звужаючы яго тэрыторыю свабоды. Спачатку гэта ўшчуванне («Загад партыі дадзены, а ты ў балота?»), а потым пагроза: «Мы цябе за разлажэнне дысцыпліны па галоўцы не пагладзім» [11, с. 44]. Лаўрэн мусіць ахвяраваць свабодай дзеля абавязку, бо са слоў старшыні вынікала, што яго прагулы на руку класаваму ворагу: тады «падае дысцыпліна, падае вытворчасць, развальваецца гаспадарка, тады кулак можа красці, расцягваць, ірваць…» [11, с. 45]. Па сваёй ідэйна-мастацкай функцыі гэты эпізод адпаведны сцэне «самакрытыкі» муляра-мастака Лапко («Адшчапенец» Я. Коласа). Тое, чым жыў паляўнічы апошнім часам, «губляла сваю прывабнасць, адступала прэч. І Лаўрэн ужо з высіленнем адшукваў апраўдальныя довады. Іх не было» [11, с. 46]. У чалавеку расце беспадстаўнае адчуванне вінаватасці, бяздзейнасці, лодырніцтва, а затым – адарванасці, адзіноты, пустаты… Канечне ж, яны пераадольваюцца ў працэсе калектыўнай працы. Але і ў яе апісанні падкрэсліваецца індывідуальнасць старога Лаўрэна: «…самы несамавіты сырэц ператтвараўся ў яго руках у дабраякасную сыравіну» [11, с. 48]. Апавяданне Э. Самуйлёнка дае ўяўленне пра тое, як дэвальвацыя гуманістычных каштоўнасцей у «сцюжную» эпоху вяла да канцэптуальнай дэфармацыі літаратурнай асобы паляўнічага.

Метафарычнае пераасэнсаванне дзейнасці суб'екта палявання прывяло да ўзнікнення ў гуманітарным навуковым дыскурсе мяжы XIX–XX стагоддзяў. паняцця паляўнічага тыпу ведаў. Аб яго станаўленні напісаў прафесар К. Гінзбург у кнізе «Міфы. Эмблемы. Прыметы: марфалогія і гісторыя» [12]. Вучоны выказвае гіпотэзу, што, магчыма, сама ідэя аповеду, у яго адрозненні ад замовы ці малітвы, упершыню ўзнікла сярод паляўнічых. («Вам пра зуброў паляўнічы ў нас кожны раскажа», – запэўнівае М. Гусоўскі, не сумняваючыся, што «галоўнае – як ты раскажаш» [1, с. 60].) Уласцівую паляўнічаму здольнасць будаваць «доказавую парадыгму» на аснове няззначных фактаў вопыту бліскуча дэманструе герой рамана У. Эка «Імя ружы».

Разгляд мастацкага тыпу паляўнічага ў гуманітарным кантэксце дазваляе зрабіць наступныя высновы. У аснове «мужчынскай» (Ю. Лотман) тыпалогіі персанажаў палягае сацыяльны фактар. Побач з універсальна- і нацыянальна-прэцэдэнтнымі вобразамі ў літаратуры з'яўляюцца мастацкія характары, народжаныя сацыяльнай рэчаіснасцю, але адаптаваныя для рэалізацыі пэўных эстэтычных мэт. У новай беларускай літаратуры тып паляўнічага часта ўтварае двуадзінства з постаццю палясоўшчыка (К. Вераніцын, Я. Лучына, Ядвігін Ш., Якуб Колас). З пачатку XX стагоддзя ён церпіць істотныя канкрэтна-гістарычныя змены (С. Хурсік, М. Чарот), але працягвае захоўваць некаторыя ўстойлівыя асабовыя дамінанты: дасціпны розум, назіральнасць, адчуванне сувязі ўсяго існага (М. Прышвін, У. Караткевіч). Між тым «паляўнічае шчасце» страчвае сваю паўнату ў часы татальнай несвабоды (Э. Самуйлёнак). Гіпатэтычна паляўнічы мог быць першым, хто «расказаў гісторыю» праз звязную паслядоўнасць падзей. Метафара палявання ляжыць у аснове доказавай парадыгмы, вылучанай на мяжы XIX–XX стагоддзяў. Інтэлектуальныя намаганні даследчыка К. Гінзбург узводзіць да «паляўнічага» тыпу ведаў, які апелюе ад прыватных эмпірычных фактаў да недаступнай прамому назіранню рэальнасці.


Літаратура

1. *Гусоўскі, М.* Песня пра зубра / М. Гусоўскі ; Пер. на беларус. мову Я. Семяжона. – Мінск : Маст. літ., 1980 – 190 с.
2. *Куляпин, А. И.* Мифология советской повседневности в литературе и культуре сталинской эпохи : монография / А. И. Куляпин, О. А. Скубач ; отв. ред. И. В. Силантьев. – М. : Языки славянской культуры, 2013. – 240 с.

References

1. *Gusouski, M.* Pesnya pra zubra / M. Gusouski ; Per. na belarus. movu Ya. Semyazhona. – Minsk : Mast. lit., 1980. – 190 s.
2. *Kulyapin, A. I.* Mifologiya sovetskoy povsednevnosti v literature i culture stalinskoy epokhi : monografiya / A. I. Kulyapin, O. A. Skubach ; otv. red. I. V. Silantyev. – M. : Yazyki savyanskoy kultury, 2013. – 240 s.

3. *Караткевіч, У.* Каласы пад сярпом тваім: Раман, кн. 2. / У. Караткевіч // Зб. тв. У 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 5. – 526 с.
4. *Тургенев, И. С.* Записки охотника / И. С. Тургенев. – М. : Худож. лит., 1984. – 254 с.
5. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускае літаратуры / А. Адамовіч. – Мінск : Выдавец ІП Зміцер Колас, 2005. – 1464 с.
6. *Карский, Е. Ф.* Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский ; предисл. к третьему тому И. Н. Запрудского, И. В. Казаковой, В. Г. Короткого ; коммент. к первой книге И. В. Казаковой. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 3, кн. 1. Очерки словесности белорусского племени – 584 с.
7. *Колас, Я.* Вершы. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія «На ростанях» / Якуб Колас ; прадм. М. Мушынскага. – Мінск, 2007. – 1168 с.
8. *Бядуля, З.* Сон Анупрэя [Электронны рэсурс] / З. Бядуля. – Рэжым доступу: http://biadulia.ru/mstories/84.htm. – Дата доступу: 11.02. 2016
9. Веснаход: Апавяданні «Маладняка» [Уклад., падрыхт. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. І. П. Чыгрына]. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 518 с.
10. *Пришвин, М. М.* Дневники / М. Пришвин ; сост., предисл. и комм. Ю. А. Козловского. – М. : Правда, 1990. – 480 с.
11. *Самуйлёнак, Э.* Паляўнічае шчасце / Э. Самуйлёнак // Апавяданні і аповесць. – Мінск, 1977. – 208 с.
12. *Гинзбург, К.* Мифы. Эмблемы. Приметы : Морфология и история [Электронный ресурс] / К. Гинзбург. – Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Culture/ginz/index.php. – Дата доступа: 05.11.2016

3. *Karatkevich, U.* Kalasy pad syarpom tvaim: Raman, kn. 2. / U. Karatkevich // Zb. tv. U 8 t. – Minsk : Mast. lit., 1989. – T. 2. – 526 s.
4. *Turgenev, I. S.* Zapiski okhotnika / I. S. Turgenev. – M. : Khudozh. lit., 1984. – 254 s.
5. *Adamovich, A.* Da gistoryi belaruskaye litaratury / A. Adamovich. – Minsk : Vydavets IP Zmitser Kolas, 2005. – 1464 s.
6. *Karskiy, Ye. F.* Belorusy : v 3 t. / Ye. F. Karskiy ; predisl. k tretyemu tomu I. N. Zaprudskogo, I. V. Kazakovoy, V. G. Korotkogo ; comment. k pervoy knige I. V. Kazakovoy. – Minsk : Bel”n, 2007. – T. 3, kn. 1. Ocherki slovesnosti belorusskogo plemeni. – 584 s.
7. *Kolas, Ya.* Vershy. Paemy. Apavyadanni. Apovestsi. Trylogiya “Na rostanyakh” / Yakub Kolas ; pradm. M. Mushynskaha. – Minsk, 2007. – 1168 s.
8. *Byadulya, Z.* Son Anupreya [Elektronny resurs] / Z. Byadulya. – Rezhym dostupu: http://biadulia.ru/mstories/84.htm. – Data dostupu: 11.02.2016.
9. Vesnakhod: Apavyadanni “Maladnyaka” [Uklad., padrykht. tekstau, ustup. artykul i kament. I. P. Chygryna]. – Minsk : Mast. lit., 1987. – 518 s.
10. *Prishvin, M. M.* Dnevniki / M. Prishvin ; sost., predisl. i komm. Yu. A. Kozlovskogo. – M. : Pravda, 1990. – 480 s.
11. *Samuylyonak, E.* Palyaunichaye shchastse / E. Samuylyonak // Apavyadanni i apovests. – Minsk, 1977. – 208 s.
12. *Ginzburg, K.* Mify. Emblemy. Primety : Morfologiya i istoriya [Elektronny resurs] / K. Ginzburg. – Rezhim dostupa: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Culture/ginz/index.php. – Data dostupa: 05.11.2016.